# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# М. А. ЛЯХОЎСКАГА

**Перыяд дзеяння:**

верасень 1941 г. – снежань 1943 г.

**Месца дзеяння:**

г. Віцебск, чыгуначны вузел

**Колькасць:**

13 чалавек

**Кіраўнікі:**

Ляхоўскі М. А.

Дзейнічала ў Віцебску з верасня 1941 г. да снежня 1943 г. Вылучылася з падпольнай групы М. Я. Нагібава. Аб’ядноўвала 13 чалавек. Кіраўнік М. А. Ляхоўскі. У склад групы ўваходзілі яго сястра В. А. Ляхоўская (Навумчык), С. У. Воранаў, Г. П. Жаўрыд, М. Жыгуноў, А. Гагарын, Я. Г., В. Г. і В. С. Сцяпанавы, А. А. Залецкі, Я. І. Лазоўскі, І. Ц. Куракоў, В. Іваноў.

Патрыёты здабывалі зброю, дакументы, парушалі сувязь, накіроўвалі да партызан ваеннапалонных і мясцовых жыхароў, стваралі аварыйныя сітуацыі на чыгуначным вузле, падсыпалі пясок у буксы вагонаў і інш. У дыверсіях прымалі ўдзел усе члены групы. Ляхоўская, В. С. Сцяпанава, Лазоўскі, Іваноў дастаўлялі ў горад тол і міны, Залецкі, Іваноў, Воранаў, якія працавалі на вугальным складзе, падкідвалі замаскіраваныя пад вугаль міны, падкладвалі міны пад прыстанцыйныя баракі, дзе чакалі адпраўкі нямецкія салдаты. У кастрычніку – лістападзе 1943 г. Жыгуноў, Лазоўскі, Жаўрыд і Іваноў устанавілі на рухомых цягніках 11 мін, якія спрацавалі ў дарозе. У кастрычніку 1943 г. Іваноў падклаў чатырохкілаграмовую міну пад вагон з ракетамі. Браты Сцяпанавы займаліся разведкай у Віцебску і на ст. Лосвіда, куды па даручэнні Нагібава пераехаў Я. Г. Сцяпанаў.

У сярэдзіне лістапада 1943 г. 28 віцебскіх падпольшчыкаў, у тым ліку з групы Ляхоўскага, на чале з Нагібавым выйшлі з Віцебска і сустрэліся з наступаючымі танкавымі часцямі Чырвонай арміі.

Падпольшчыкі, якія добра ведалі мясцовасць, аказвалі дапамогу чырвонаармейцам; на працягу 16 дзён яны трымалі абарону ў раёне вёсак Цыганы – Малыя Стайкі Гарадоцкага раёна. Я. Г. Сцяпанаў з групай танкістаў падарваў стрэлачныя пераводы на ст. Лосвіда. В. Г. Сцяпанаў выконваў ролю правадніка, некалькі разоў з армейскай разведкай браў «языка».

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай арміі многія падпольшчыкі пайшлі на фронт. Загінулі С. У. Воранаў, Г. П. Жаўрыд, М. А. Ляхоўскі.

У Віцебску ў гонар падпольшчыкаў М. і В. Ляхоўскіх, С. Воранава, А. Залецкага на будынку сярэдняй школы № 18, дзе яны вучыліся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група М. А. Ляхоўскага / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 490–491.

2. **Подпольная** группа Ляховского Н. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 290–291.